Cana asobnaha numaru 20 hr. Pierasyłka apłačana ryčałtam.

Nr. 14 (559). Wilnia, Niadziela 25 Sakawika 1934 h. Hod X (XVIII).

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i literaturnaja hazeta.

Adres Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

„Biel. KRYNICA" kaštuje na hod—4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy—1 zał. Zahranicu ŭdwaja daražej. Ceny abwiestak pawodle ŭmowy.

НА ДЗЕНЬ 25.III.

(70-лецьце сьмерці Кастуся Каліноўскага, 50-лецьце «Гоману», 16-лецьце Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі).

Сьмерці няма — кажуць філёзафы, — а ёсьць вечнае жыцьцё і вечны развой і поступ. Пацьверджаньнем гэтай праўды ў нас зьяўляецца між іншым так-жа і акт 25.III, акт абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі 16 гадоў таму. І сапраўды, акт гэты, які на супроць розных цёмных магутных сілаў, ськіраваных проціў Беларускага Народу, выявіў няўхільную волю гэтага народу жыць і разьвівацца і жыць поўным, самастойным жыцьцём, сьведча дастатачна, што сьмерць — гэта толькі ўраеньне, што сьветам валадарыць непакананае жыцьцё і яго таёмныя правы.

Вось-жа з гэнай вечнай крыніцы жыцьця выплыў і акт 25 сакавіка, які ў беларускай вызвольнай гісторыі мае ўжо сваіх папярэднікаў, сваіх прадвесьнікаў. А гэткімі ёсьць: дыктатар нашага краю пад час паўстаньня 1863 г. Кастусь Каліноўскі з першай беларускай часопісяй „Mużyckaj Praudaj" і беларускія народавольцы так-жа з часопісяй «Гоман». І праца дыктатара і праца народавольцаў і акт абвешчаньня незалежнасьці Беларусі — гэта праяў у сутнасьці таго-ж вечнага жыцьця на паняволеных гонях Беларусі.

Сяньня ў дзень акту 25 сакавіка ўспамінаем і аб яго гэных прадвесьніках дзеля таго, што яны нямала прычыніліся да гэнага акту і дзеля таго, што сёлета, калі акту 25 сакавіка сьвяткуем 16-тыя ўгодкі, яны так-жа сьвяткуюць сёлета свае ўгодкі, яны сёлета так-жа юбілянты. Сёлета прыпадае 70-лецьце (1864) сьмерці Каліноўскага і 50-лецьце (1884) «Гоману».

Народы жывуць спрадвякоў, але ў гісторыі сваей доўгі час жывуць яны часта не сваім жыцьцём, а чужым. жывуць яны не для сябе, а для другіх, нават часта і ня чуючы ў сабе таго, што яны самастойныя адзінкі, якія ў сабе крыюць нязнаныя дагэтуль сілы і якія могуць жыць сваім уласным нацыянальным жыцьцём.

Пачатак мінулага сталецьця прынёс народам паняцьце нацыянальнасьці, прынёс нацыянальную ідэю, ідэю вызваленьня народаў з пад чужога панаваньня палітычна-грамадзкага і эканамічнага.

На Беларусі, пераважна ў Заходняй яе часьці, першым барцом за гэткія ідэалы быў Кастусь Каліноўскі, які сваей першай беларускай часопісяй і ўсей сваей рэвалюцыйнай вызвольнай працай сапраўды пасеяў добрае і здаровае зярнё на беларускіх гонях, зярнё волі народу і дабрабыту.

Сутнасьць палітычна-грамадзкай ідэолёгіі Каліноўскага гэткая: з усіх зямель бышага Вялікага Княства Літоўскага, вырваўшы іх з царскай расейскай няволі, стварыць самастойную дзяржаўную адзінку вольных народаў: беларускага, літоўскага і ўкраінскага і фэдэрацыйна злучыць яе з Польшчай. Ідэалы фэдэралізму ў той час былі моныя; гэткім ідэалам верна служыў у нас К. Каліноўскі і за іх — 70 гадоў таму — павіс на шыбеніцы. Прыгожы, як бачым, зрабіў ён пачатак барацьбы.

Зярнё вызваленьня, кінутае Каліноўскім на беларускія, прадусім заходнія гоні, не змарнела: яно па пятнаццацёх гадох абышло і пачало надзейна далей расьці ўжо пераважна ў Беларусі Усходняй.

У Расеі ў 70-тых гадох мінулага сталецьця за палітычна-грамадзкае вызваленьне з пад царскага ўціску вялі барацьбу сьпярша так званыя „землевольцы" а пасьля (1879—1885) «народавольцы». У радох гэтых апошніх былі беларусы, як напр. ведамы Ігнат Грыневецкі, Кавалік і інш.

Палітычныя ідэалы народавольцаў падобныя да ідэалаў Каліноўскага; і яны імкнуліся да таго, каб з Расейскай імпэрыі паўстаў вольны саюз самастойных народаў, але ўжо ня з Польшчай, а ў фэдэрацыі з Расеяй. Найбольш яскрава гэтую ідэю праводзілі і найбольш шырока гэную фэдэрацыйную самастойнасьць разумелі — гэта народавольцы ўкраінскія і так-жа беларускія.

Беларускія народавольцы 50 гадоў таму дзеля большага апрацаваньня гэтай ідэі і дзеля большага яе пашырэньня, выдавалі тайксм ад паліцыі часопісь «Гоман». Часопісь гэта, якой вышла два нумары, хоць выходзіла чамусьці парасейску, перапоўнена ідэяй аб самастойнай Беларусі ў фэдэрацыйнай лучнасьці з Расеяй.

Дапяць сваіх высокіх мэтаў ані расейскім, ані беларускім народавольцам не ўдалося. Цар іх пераможа. Аднак воля жыцьця паднявольных народаў расла далей і крапчэла аж пакуль не перавярнула царскага трону.

Сталася гэта, як ведаем, у 1917 г. пасьля якіх 30-х гадоў па народавольцах.

Воля розных народаў, дагэтуль царскіх нявольнікаў, жыць самастойна абудзілася з нябывалай сілай. Гэткая воля — у кірунку ўжо поўнай незалежнасьці — праявілася і ў народзе беларускім праз акт 25.III.1918. Праўда, правясьці ў жыцьцё ідэал незалежнасьці Беларусі ня далі намсуседнія імпэрыялізмы, аднак хто-ж ня бача, як ідэал гэты сапраўды расьце, што-раз большай набірае сілы, што-раз шырэйшыя пранікае пласты беларускага народу!?

Гэта за ідэал незалежнасьці сяньня церпяць сыны Беларусі па вастрогах, гэта ідэал гэны сяньня — найбольшая абраза ворагаў беларускага народу.

Знача, ідэал незалежнасьці Беларусі жывы і творчы. Магутным ручём выплывае ён з вечнай крыніцы жыцьця, змывае няволю Беларусі і рыхтуе гэтую Краіну да волі і долі — да незалежнасьці!..

Biełaruskaje narodnaje świata.

Heta byŭ dzień 25 sakawika 1918 hodu. Nad Biełarusiaj tady jaskrawa hareła zaŭsiody dobraje sonca. Tej ranicy jano płamiennaje radasna ŭschodziła nad Smalenskam, što raz wyšej borzda išło ŭ haru pa niebie i ŭ pałudni užo śmiajučysia hladzieła na poŭny tryumfu Miensk. Pa pałudni-ž uznoŭ, źwiarnuŭšysia na zachad, jano čyrwonaje pakaciłasia daloka, da loka až za Biełastok.

U heny dzień siabry Rady Biel. Narodnaj Respubliki sabralisia ŭ Miensk i ahłasili tam Biełaruś niezaležnaj.

25 sakawika 1918 hodu heta historyčny fakt dla biełaruskaha narodu.

Pawiejeła tady nad Biełarusiaj nowym žyćciom.

Heny dzień usie biełarusy razumieli tady i razumiejem my jaho ciapier jak dzień uskrašeńnia narodu i hety dzień biełarusy naznačyli sabie dniom swajho wialikaha nacyjanalnaha świata.

Tady na twarach Biełarusi dziacicej rysawałasia niejkaja nieapisanaja radaść, usiudy widałasia žyćcio, zdawoleńnie i ščaście.

Nam ciapier u šasnastyja ŭhodki henaha momentu, jak-ža miła prypaminać heny duchowy tryumf Biełaruskaha Narodu ŭ dzień 25 sakawika 1918 hodu.

Ale chutka paśla taho na biełaruskim niebie zachmaryłasia sonca. Udaryŭ zaraz hrom z Maskwy! Jak złudny son, uciakło tady z Biełarusi nowaje jaje žyćcio. Jano maładoje nia wydzieržała aružnaha naporu sa starany Maskwy. Jano maładoje nia wydzieržała tak-ža naporu i z druhoha boku Heta často zdarajecca na świecie, što fizyčnaja siła rasciraje choćby najbolš wysokija ludzkija idealy, ale... da času!

Samalubnyja našy susiedzi prycisnuli światyja ideały biełaruskaha narodu.

Ale heny dzień astaŭsia nazaŭsiody wialikim dla biełaruskaha narodu.

Siahońnia šasnastyja ŭhodki ad taho času my światkujem, dumajučy hłybiej ab patrebach swajho narodu.

My wiedajem, što ŭ narodzie našym biełaruskim schawanaja jość wialikaja siła. Siła, što raźbiwaje najćwiardziejšyja skały, padymaje i razrywaje łancuhi najciažejšyja i niawolu najstrašniejšuju pieramahaje.

Jana pieršy raz na świet pakazałasia ŭ henym dni 25 sakawika 1918 h.

Ciapier u nas pawinna zakaranicca hłybokaje pierakanańnie, bo ŭ hetym naša moc, — što my swaimi siłami zdabudziem sabie świetłuju budučyniu, da čaho my hetak šybka idziom siahońnia.

Čaho-ž jašče druhoha ŭ heta świata nam chacieć treba?

Z paznannia samych siabie i našych siłaŭ wyrastajuć u nas peŭnyja sprawiadliwyja žadańni. Adno najważniejšaje naša žadańnie zaŭsiody budzie, kab biełaruski narod z usich kutkoŭ etnagrafičnaj Biełarusi ažywiŭsia ducham wialikaj biełaruskaj sucelnaści.

Urešcie nam siahońnia hanić treba ŭsich tych biełarusaŭ, jakija adważwajucca raźbiwać našu strojnuju sucelnaść. Henych marnatraŭnych synoŭ Biełarusi my bačym, jak stajać jany na kaleńniach pierad worahami našymi, jak całujuć im ruki, prosiačy ad ich dla siabie łaski. Jany hetym užo asłablajuć našy narodnyja siły, panižajuć honar narodu i hetak zadzieržywajuć hety narod u jahonym chodzie da lepšaha žyćcia.

Heny soniečny dzień 25 sakawika 1918 hodu žywa prypaminajecca nam siahońnia. Jon nacyjanalnym žaram razahrawaje dušu kožnaha biełarusa. Dyk usie my ciapier supolnymi, družnymi rukami, u ščyraj zhodzie śpiašajmosia dom narodny budawać!..

D—a.

Думкі незалежніка.

Калі кінема думкамі ў далёкую мінуўшчыну, у тыя часы, аб якіх гісторыя злажыла нам беспярэчныя доказы незалежнага бытаваньня Беларусі, (Княства Полацкае і Вялікае Княства Літоўска-Беларускае) і параўняема слаўную мінуўшчыну з жудаснаю сучаснасьцю Беларускага Народу, агортвае ляк і непакой.

Сотні гадоў таму беларускія плямёны Крывічоў і Дрыгвічоў, найшоўшы ў сабе жыцьцёвую сілу і мудрасьць, ня толькі здалелі зраўняцца з другімі славянскімі плямёнамі, але й аперадзілі іх у многім. А пакрытыя сёньня векавым пылам, і пажаўцеўшыя ад часу пэргаміны, раскіданыя па чужацкіх музэях, сьведчаць аб нашай слаўнай мінуўшчыне, і лучнасьці паміж ёй і сучасным Беларускім Народам.

І гэтую лучнасьць ня здолелі зьніштожыць ані векавы пыл, ані ягоныя ворагі чужынцы. Лучнасьць паміж мінуўшчынай і сучаснасьцю ня спынілася.

Народ, які сотнямі гадоў ператрываў у чужацкай няволі, пакінуты сваей інтэлігенцыяй, перайшоўшай у чужацкія служкі, ня згубіўшы ў гэтым паднявоненьні свайго нацыянальнага я, будзе жыць.

Агульны гадавы сход Рады Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры.

У нядзелю дн. 18.III. г. г. адбыўся звычайны гадавы сход Рады Бел Інстытуту Гаспадаркі і Культуры. Дзеля таго, што гэты сход ад пачатку існаваньня Інстытуту можа меў найбольшае значэньне, мы пасьвяцім яму асаблівую ўвагу.

I. Адчыненьне сходу.

А гадзіне $17^1/_2$ сход быў адчынены старшынёю Цэнтральнага Ураду Інстытуту Кс. В. Гадлеўскім. Пасьля адчытаньня параграфаў 28, 30 і 31 Статуту, датычачых сходаў Рады, Кс. В. Гадлеўскі прапануе сходу выбраць старшыню сабраньня. Праз аклямацыю выбіраецца аднагалосна на старшыню др. Б. Грабінскі, які займае месца за прэзыдыяльным сталом, на свайго заступніка просіць інж. А. Клімовіча, а на сэкратара магістра Ст. Станкевіча.

Пасьля выбараў прэзыдыюму прыймаецца сходам такі парадак дня: 1) справаздача Цэнтр. Ураду з дзейнасьці за 1933 год, 2) арганізацыя Б. Інстытуту Г. і К. на новых асновах, 3) выбары новага Цэнтр. Ураду і Рэвізыйнай Камісіі, 4) бягучыя справы.

II. Справаздача з дзейнасьці за 1933 год.

Пасьля прыняцьця парадку дня слова было дадзена старшыне Цэнтр. Ураду Кс В. Гадлеўскаму, які ад імя Цэнтр. Ураду даваў справаздачу за 1933 год. Справаздаўца падзяліў сваю справаздачу на тры часьці: 1) арганізацыйныя справы, 2) фінансавыя справы, 3) стан працы Інстытуту ў лічбах.

1) Што датычыць арганізацыйных спраў, то арганізацыя новых гурткоў Інстытуту ў 1933 годзе ня йшла такім быстрым тэмпам, як было даўней, а гэта з прычыны страшэннай галіты вёскі. Закладчыкі гурткоў на правінцыі, спатыкаліся часта з такімі зьявішчамі, што нашаму селяніну трудна было знайсьці 1 зл. упісных і 1 зл. гадавой сяброўскай складкі. З гэтай прычыны некаторыя гурткі звальнялі сваіх болей дзейных сяброў ад усялякіх складак з тым, што праца такога незаможнага сябры, уложаная ў гурток, ёсьць найлепшай складкай; некаторыя ізноў гурткі прасілі Цэнтралю звольніць іх ад прысылкі палавіны сяброўскіх складак, бо і ў самых нястача. Цэнтраля па магчымасьці ішла насустрэч гэтым жаданьням.

Другою перашкодаю ў дзейнасьці Інстытуту было няпрыхільнае адношаньне адміністрацыйных уладаў. Дакладчык зьвярнуў увагу на пару фактаў. І так — яшчэ ў 1932 годзе быў заложаны гурток у в. Гайніне, Баранавіцкага пав. і заява аб закладзінах была пераслана ў Баранавіцкае стараства. Аднак старасва дзеля нейкіх прычын адмовілася зарээстраваць гэты гурток. Тагды быў пададзены рэкурс да Наваградзкага ваяводы; ваяводзтва дзяржала справу роўна 2 гады і толькі ў верасьні 1933 г. пасьля таго, як былі зроблены мнагаразовыя захады ў міністэрстве Унутраных Спраў у Варшаве, ваяводзтва прыслала прыхільны адказ. Другі факт. Быў ад 1927 году гурток у Варакомшчыне, Наваградзкага павету. Ня вёў ён шырэйшай працы, але меў бібліятэчку, пашыраў бел. друкаванае слова і сусім бязьдзейным ня быў. Тымчасам у жніўні месяцы 1933 г. гурток атрымаў ад Наваградзкага старасва паперу, у каторай было паміж іншым сказана так: „postanawiam zawiesić działalność Białoruskiego Instytutu Gospodarki i Kultury, oddział w Worokomszczyźnie, gdyż stowarzyszenie nie przejawia żadnej działalności tak wewnątrz stowarzyszenia, jak również, nazewnątrz“. Супярэчнасьць у гэтым уматываваньні кідаецца ў вочы сама сабою, бо як можна завешваць дзейнасьць за бязьдзейнасьць? Пасьля гэтага былі паліцыйныя досьледы і аб дзейнасьці ці „бязьдзейнасьці іншых гурткоў. Паліцыя прыходзіла і пыталася ў сяброў, што вы робіце, у чым праяўляецца ваша дзейнасьць і г. д. Трэці факт — незарэестраваньне гуртка ў В. Быхаўшчыне, Нясьвіскага павету. Адмовілася рэестраваць гэты гурток і Нясьвіскае старасва і Наваградзкае ваяводзтва. Ваяводзтва матывавала тым, што мае „uzasadnione powody do stwierdzania, że działalność koła będzie wykraczać poza ramy przepisów, określonych statutem, z uwagi na bezpieczeństwo i porządek publiczny“.

Нядаўна залажыўся новы гурток у Анісімавічах і паданы да рэестрацыі ў Баранавіцкае старасва, а дзеля таго, што старасва болей 4-ох тыдняў нічога не адказала, гурток паводле закону аб Т-вах трэба ўважаць за рэестраваны.

Наагул гурткоў Інстытут мае 51, з гэтых некаторыя не праяўляюць большай дзейнасьці, а некаторыя працуюць сусім добра. Да найбольш дзейных трэба залічыць гурткі: у Будславе, Шальцінах, Белай, Шутавічах, Жодзішках, Расьле і інш. Сяброў усяго было 937.

2) Фінансавыя справы Цэнтралі і гурткоў стаялі не на належнай вышыне. Даўно мінулі тыя часы, калі Інстытут атрымоўваў сталыя дапамогі ад Бел. Пасольскага Клюбу, цяпер Інстытут жыве толькі з ахвяр і сяброўскіх складак. Ужо ў самым існаваньні Інстытуту, заяўляе дакладчык, праяўляецца жывучасьць беларускага народу, бо паміма фінансавых недастаткаў, Інстытут жыве і працуе. Польскія і іншыя арганізацыі на правінцыі атрымоўваюць часта вялікія дапамогі з цэнтру, а Інстытут ня толькі не дае ніякай дапамогі сваім гуртком і працаўнікам, але яшчэ атрымоўвае ад гурткоў гэтую дапамогу ў форме палавіны сяброўскіх складак. Гэта сьведчыць аб вялікай ідэйнасьці некаторых гурткоў і працуючых там людзей, а так-жа аб тым, што зарганізаваны беларускі народ умее перамагаць усе злыбяды. Даходу з ахвяр і складак Цэнтраля Інстытуту мела 539 зл. 34 гр.

3) Дзейнасьць Цэнтралі і гурткоў у лічбах прадстаўляецца так: бібліятэк-чытальняў ёсьць каля 50, бо амаль ня кожны гурток мае сваю бібліятэчку-чытальню; Цэнтраля давала дапамогу кніжкамі, рассылаючы іх ня толькі ў гурткі, але і прыватным асобам з мэтай пашырэньня бел. друкаванага слова; лекцыяў і рэфэратаў было прачытана каля 70; прадстаўленьняў — больш 100; была выдана пад фірмай Інстытуту пры помачы друкарні ім. Скарыны адна кніжка: „Беларускія Цымбалы“ В. Адважнага. Гэтак прадстаўляецца праца Інстытуту паводле справаздачаў ужо прысланых, ёсьць-жа гурткі, якія дагэтуль, паміма прыпамінаньня, яшчэ ня прыслалі справаздачы з сваей дзейнасьці. Калі-б прыслалі ўсе гурткі, то праца ў лічбах была-б вялікшай і болей дакладна. Некаторыя дакладныя справаздачы былі друкаваны ў „Б. Крыніцы“.

На гэтым справаздача была закончана. У дыскусіі над справаздачай выявілася, што перашкоды ў дзейнасьці Інстытуту бываюць на вёсцы ня толькі з боку вышэйшай (павятовай і ваяводзкай) улады, але і з боку ніжэйшай у асобе паліцыянтаў, якія на сваю руку робяць розныя „досьледы“ і прыкрасьці, інтэрэсуючыся лішне некаторымі сябрамі Інстытуту. Такое непатрэбнае зварочваньне ўвагі з боку паліцыі на болей дзейных сяброў Інстытуту ёсьць аднэй з вялікіх перашкодаў у яго разьвіцьці.

Пасьля дыскусіі над справаздачай уступаючага Цэнтр. Ураду было яму дадзена абсолюторыюм.

II. Арганізацыя Б. Інстытуту Г. і К. на новых асновах.

Скончыўшы са справаздачай Рада перайшла да найважнейшага пункту, які стаяў на парадку дня — да арганізацыі Інстытуту. Праект гэтай арганізацыі быў прыняты на паседжаньні Цэнтр. Ураду дн. 4.III. г. г. і надрукаваны ў 12 нумары „Б. Крыніцы“. Дакладчык, Кс. В. Гадлеўскі, прачытаў зьмест гэтага праекту. Паводле яго мелі-б утварыцца пры выканаўчых органах Інстытуту 4 сэкцыі: 1 — эканомікі і статыстыкі, 2 — этнографіі і архэолёгіі, 3 — гісторыі і соцыёлёгіі, 4 — літэратуры і мастацтва. У гэтых сэкцыях мае сканцэнтравацца ўся навуковая праца Інстытуту; на чале кожнай сэкцыі стаіць сэкрэтар.

Над праектам пачалася дыскусія. Некаторыя прамоўцы прапануюць 4-ю сэкцыю разьбіць на дзьве: а) літэратуры і языка, б) мастацтва, значыць, стварыць не 4, а 5 сэкцыяў; ізноў-жа некаторыя прапануюць стварыць толькі 2 сэкцыі: а) гаспадарча-соцыялёгічную і б) гісторыі і мастацтва. Аднак пасьля даўжэйшай дыскусіі высьняецца, што запрапанаваны Урадам праект найлепш адпавядае цяперашнім жыцьцёвым умовам і прыймаецца ўсімі галасамі проціў аднаго.

Пасьля прыняцьця праекту прыступлена да выбару сэкрэтароў сэкцыяў. Выбраны на сэкрэтароў:

1 сэкцыі — эканомікі і статыстыкі — інж. А. Клімовіч,

2 — этнографіі і архэолёгіі — абс. М. Пецюкевіч,

3 — гісторыі і соцыёлёгіі — мгр. М. Шкялёнак,

4 — літэратуры і мастацтва — мгр. Ст. Станкевіч.

З далейшай дыскусіі на тэму арганізацыі сэкцыяў пастаноўлена, што кожная сэкцыя ў кругу сваей дзейнасьці працуе аўтанамічна, будучы пры гэтым у заўсёдным кантакце з Цэнтр. Урадам і паведамляючы яго аб сваіх паседжаньнях і працах. Праектаваны музэй пастаноўлена ўтварыць пры сэкцыі этнографіі і архэолёгіі, а бібліятэку —безпасярэдна пры Цэнтр. Урадзе.

У часе дыскусіі над гэтымі апошнімі пунктамі была паднята справа адносін да існуючага ўжо бел. музэю і бібліятэкі, прычым была выражана баязьнь, ці ня будзе конкурэнцыі паміж гэтымі дзьвюма арганізацыямі. Аднак пры

Абудзіўшыся з векавечнага сну, наперакор ворагам ягоным і грабаром, Беларускі Народ, рвучыся да новага жыцьця, ужо сьведамы сваіх правоў, голасна й рашуча імкнецца да незалежнага жыцьця і адбудовы сваей Бацькаўшчыны— жадае быць гаспадаром на землях спрадвеку да яго належачых.

Але шлях, вядучы да незалежнасьці, да зьдзейсьненьня ягоных ідэалаў, цяжкі і цярністы. І хто ведаець: мо' тысячы ахвяр засьцеляць цярністую пуцявіну, тысячы лепшых сыноў аддадуць сваё жыцьцё, каб дайсьці да канечнае мэты.

Ці пройдзе гэты шлях, ці знайдзе ў сабе столькі сілы й гарту, каб, ахвяроўваючы жыцьцё сваіх лепшых сыноў, скінуць назаўсягды ганьбячыя і няволячыя аковы і стацца вольным сярод вольных?

Неспажытыя сілы Беларускага Народу, вякамі выпрабаваны гарт, любоў да сваёй зямелькі—разьвейваюць сумліў і мы верыма што ён дойдзе!

Мусіць дайсьці! Бо калі астановіцца на паўдарозе—нельга ўжо будзе варочацца назад, дзе будуць яго чакаць ня толькі паняверка і няволя, але мо' і сама сьмерць...

Ці дойдзе да сваей канечнай мэты сам, бяз помачы другіх? Чужое помачы не адкінець, як не адкідаў яе дасюль. Змагаючыся за сваю волю, заклікае братнія яму паняволеныя народы, каб супольнымі сіламі ламаць перашкоды, што стаяць на дарозе да зьдзейсьненьня супольных ідэалаў.

Калі па праву законаў прыроды збушаваныя воды разьбіваюць і зносяць спыняючыя іх перашкоды, дык па адвечнаму праву жыцьця зломяць паняволеныя народы, а сярод іх і беларусы, штучна збудаваныя запоры, каб выйсьці на шлях вольнага і незалежнага жыцьця. Незалежнік.

Dr. St. Hrynkiewič.

Škarlatyna.

Nadta raspaŭsiudžanaja zaraznaja chwaroba. Kažuć ab joj „chwaroba dziciačaja“, dziela taho, što chwarejuć na hetu chwarobu amal nia wyklučna dzieci. Traplajecca adnak jana i ŭ darosłych ludziej. Chwaroba nadta častaja i niebiaśpiečnaja. Niebiaśpieka mo' nie ŭ samoj chwarobie, skolki ŭ komplikacyjach, jakija wyklikaje. Z komplikacyjaŭ najbolš častyja i niebiaśpiečnyja — zapaleńnie wucha siaredniaha, chwaroba serca, chwaroba sustawaŭ.

Raspaŭsiudžwajecca škarlatyna praz blizkija znosiny z chworym, praz ludziej, jakija sustrakajucca z chworym, praz karystańnie z wopratki, paścieli chworaha, ahułam z pradmietaŭ, jakija chwory mieŭ kala siabie. Wiedajučy ab hetym, treba aścierahacca pradmietaŭ pamianionych, kali jany nia byli wydezynfikawany. Chwory moža zarazić jašče ŭ 7—8 tydniaŭ ad pačatku chwaroby.

Chworaść prajaŭlajecca raptoŭna trascaju, wanitami i wialikaju haračkaju. Užo na pieršy abo na druhi dzień pakazwajecca wysypka na šyi, hrudziach i plečach, a potym na ŭsim ciele. Wysypka spačatku wyhladaje na malusieńkija kropki, jakija byccam rastuć, źliwajucca adna z adnoju i cieła wyhladaje, jak razmalowanaje škarłatnaju farbaju. Wysypka trymajecca da 5—7 dzion, potym skura złazić, haračka apadaje i chwory pačynaje zdarawieć. Skura schodzić niekalki tydniaŭ. Uwieś heny čas chwory lohka moža być zaraźliwym.

Kali tolki bačym niešta padazronnaje ŭ dziciaci, — jaknajchutčej treba jaho izalawać, značycca addzialić ad druhich dziaciej, dy ahułam ad ludziej, u asobnaj izbie, kamory na 5—6 tydniaŭ. Trymać chworaha ŭ łožku na't užo i paśla taho, jak skura pakinie schodzić. Biazumoŭna izalacyja budzie lepšaju ŭ lakarni, čymsia ŭ chacie. Kali jość tolki mahčymaść, nia treba škadawać hrošaŭ i addać zachwareŭšaha ŭ lakarniu — i chworamu lepš i chatnim mienšaja niebiaśpieka. Kali-ž užo astajecca ŭ chacie, dyk pomnić ab dobrym prawietrywańni pamieškańnia i ab dyjecie (najlepš małočnaje).

Usieńkaje cieła nacirać kłustaściu, alejem aukaliptusawym ci niejkim inšym dwa razy na dzień— ranicaju i ŭwiečary. Pałaskać rot pieratlonistaju ci bornaju wadoju. Pry wialikaj haraččy rabić chałodnyja wanny (wada da 24—28 hradusaŭ Reamiura), dawać chininu abo aspirynu. Kali słabieje serca (nadta časty puls) — dawać na hrudzi z lewaha boku miašok z lodam i kali niama lodu — prykładać namočany ŭ chałodnaj wadzie ručnik, dawać waleryjanawyja kapli, kamforu i inšyja.

Medycyna wiedaje siańnia dawoli peŭnyja leki pry škarlatynie — heta adumysłowyja „sywaratki škarlatynawyja“. Dawać ich moža tolki dochtar. Z komplikacyjami škarlatyny ŭ chacie zmahacca niemahčyma.

Roža.

Roža adna z najčaściejšych chwarobaŭ na wioscy, kali-b pawieryć tamu, što kažuć wiaskowyja šaptuny-znachary ci baby-waražbitki. Za bolšyja ci mienšyja hrošy ci padarki lečać jany ludziej. Wiera ŭ raspaŭsiudžanaść rožy takaja wialikaja, što Fedaroŭski woś jaki skaz ab hetym zapisaŭ*): „Roža jość u kožnaha čaławieka, ale ŭ taho anno wychodzić na wierch, chto jaje razhniewaje“. A akazii da „hniewu“ ŭ rožy pawodle henych chatnich „lekaraŭ“ jość roznyja i mnohija. Časta na wioscy niama niwodnaje chaty, dzie-b nia było rožy ŭ niejkaha z siabroŭ družyny, a padčas adna asoba maje niekalki razoŭ u praciahu paru hadoŭ.

*) U biel. etnogr. zborniku: „Lud Białoruski“.

абмене думкамі выясьнілася, што залажэньне другога музэю і бібліятэкі для беларускай справы ня толькі ня будзе шкодным, але нават карысным, бо як адна арганізацыя, так і другая будуць працаваць для аднэй мэты — для Беларусі. А калі і будзе якая рывалізацыя паміж імі, дык яна толькі будзе пабуджаць да большай працы.

III. Выбары новых уладаў Інстытуту.

Пасьля прыняцьця і зарганізаваньня сэкцыяў было прыступлена да выбару новага Цэнтр. Ураду і Рэвіз. Камісіі.

На старшыню Цэнтр. Ураду быў выбраны праз аклямацыю даўнейшы старшыня Кс. В. Гадлеўскі, што датыча іншых 6-ці сяброў ураду—было праведзена галасаваньне тайнае, у рэзультаце каторага сябрамі Ураду на 1934 год былі выбраны: Др. Б. Грабінскі, А. Стэповіч, інж. А. Клімовіч, мгр. М. Шкялёнак, мгр. Ст. Станкевіч і В. Багдановіч.

У Рэвіз. Камісію: Кс. А. Станкевіч, інж. Л. Дубейкаўскі і рэд. Я. Пазьняк.

Наагул прысутных было на радзе з правам рашаючага голасу 17 асоб. Рада складаецца з людзей, належачых да розных палітычных і соцыяльных кірункаў. Некаторыя сябры Рады не маглі прыбыць дзеля далечыні месца іхнага цяперашняга прабываньня.

IV. Вольныя прапазыцыі.

У вольных прапазыцыях А. Стэповіч падняў вельмі важную справу здабыцьця фінансавых спосабаў дзеля ажыўленьня працы Інстытуту. З гэтай мэтай А. Стэповіч прапануе зьвярнуцца да розных філянтропійных арганізацыяў, як краёвых, так і заграмічных, а так-жа багацейшых адзінак, ведамых з сваей гуманітарнай дзейнасьці і прасіць у іх дапамогі для беларускай культурнай працы. Праект гэты быў прыняты і перададзены дакладчыку А. Стэповічу дзеля канкрэтнай яго рэалізацыі.

На гэтым сход быў зачынены.

KAMUNIKAT.

Da ŭsich Hurtkoŭ Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i kultury.

Centralny Urad Bieł. Instytutu Hasp. i Kultury wydaŭ u 1932 h. „Dadatki i źmieny da Instrukcyjaŭ Bieł. Instyt. Hasp. i Kult., dzie ŭ punkcie 5-tym skazana, što Hurtkom na spektakli treba prasić dazwołu i na prośbie nakleić stemplowych marak na 5 zł., aproč hetaha za kožny dałučnik naklejwajecca pa 50 hr. Wieršy, jakija buduć deklamawacca, možna ŭpisać u prośbie. Atrymaŭšy dazwoł, płaciać jašče 5 zł.“

Woś-ža ciapier pawiedamlajem Hurtki Instytutu, što zhodna z art. 16 Ustawy z dnia 1-ha lipnia 1926 h. ab apłatach stemplowych (D.U.R.P. Nr.98, poz. 570), jakoj sucelny tekst nadrukawany, jak dałučnik da Abwieščańnia Ministra Skarbu z dnia 25.IV.1932 (D.U R.P. Nr. 41, poz. 413)—Hurtki Bieł. Instytutu Hasp. i Kult. naležać da tawarystwaŭ (zrzeszeń) praŭna isnujučych i majučych sialibu ŭ Polščy, zadačaj jakich jość wyklučna wykonwańnie kulturna-aświetnaj dziejnaści, a dziela hetaha — na padstawie artykułu 144 poz. 1 hetaj-ža ustawy prysłuhoŭwaje Hurtkom Instytutu t. zw. asabistaje *zwalnieńnie ad stemplowych apłataŭ.*

Značyć, Hurtki Bieł. Instytutu Hasp. i Kult., padajučy prośby da administracyjnych uładaŭ u sprawie atrymańnia dazwołu na spektakli-pradstaŭleńni i inš. *nie abawiazany nakleiwać na prośby nijakich stemplowych značkoŭ.*

Taksama, na *padstawie art. 160 punkt 3* henaj-ža Ustawy ab stemplowych apłatach, *hurtki ničoha nie abawiazany płacić, atrymaŭšy dazwoł.*

Dziela hetaha, prosiačy dazwołu na spektakl, treba ukancy prośby napisać tak: „*Na asnowie art. 16, 144 i 160 Ustawy Stemplowaj prosim zwolnić nas, jak kulturna-praświetnuju arhanizacyju, ad stemplowych i inšych apłataŭ*“.

Pry hetym pawiedamlajem, što ŭsie polskija kulturna-aświetnyja arhanizacyi ad takich apłataŭ zwalniajucca.

Centralny Urad
Bieł. Instytutu Hasp. i Kultury.

З царкоўнага пагосту.

ітрапалітальнае „Слово.“

У Варшаве выходзіць праваслаўная газэта „Слово“, орган Варшаўскай Праваслаўнай Мітраполіі. Друкуецца гэная газэта пераважна парасейску; бываюць артыкулы друкаваныя паўкраінску, ад часу да часу паяўляецца друк папольску і раз у год паказваецца на старонках „Слова“ друк пабеларуску.

Гэная праваслаўная часопісь мае прэтэнсію абслугоўваць праваслаўных: Украінцаў, Беларусаў і прабываючых у Польшчы Маскалёў. З першага ўзгляду на „Слово,“ яно выглядае, што абслугоўвае толькі Маскалёў, бо ў зьмесьце цалком „рускій дух“ і паклоны мужам Польшчы.

Пры гэтым трэба адзначыць, што на выдавецтва гэнай часопісі „ахвяроўваюць“ свае складкі ня толькі жменька Маскалёў, а прадусім Украінцы і Беларусы.

Дык праваслаўныя арганізацыі украінскія і беларускія маюць права і нават абавязак трэбаваць належнай часьці з гэнага празначанага фонду на выдавецтва „Слова,“ каб выраўняць самую нават справядлівасьць; з гэтага справядлівага падзелу „ахвяр“ змогуць мець хоць месячную царкоўна-праваслаўную часопісь Беларусы і Украінцы. На гэта нашы царкоўныя дзеячы павінны зьвярнуць належную ўвагу.

Іван Мітрафанчык.

Барацьба папа-маскаля з беларушчынай.

Чэрэскія прыхаджане (Браслаўскі павет), месяцаў тры таму, падалі да духоўных уладаў у Вільні просьбу, каб гэныя ўлады загадалі іхняму настаяцелю сьвяшч. А. Сьвітічу гаварыць да народу ў царкве пропаведзі пабеларуску і навучаць дзяцей Закону Божага ў роднай мове дзяцей—пабеларуску. І што-ж з гэтага? А вось што: Замест здаваленьня дамаганьняў прыхаджан, той маскаль пачаў барацьбу з беларушчынай; гэты сьвяшчэньнік, б. ахвіцэр, вельмі бароніць маскоўшчыны. Цяпер ён вышуківае ў прыходзе людзей і нагаварвае іх, каб пісалі да духоўных уладаў дамаганьні ўтрыманьня ў царкве маскоўшчыны.

Словам, поп-маскаль беларусам, сваім прыхаджанам дабравольна царквы ня ўступае і бароніць яе ад беларусаў, перахоўваючы гэтак маскоўшчыну. І дакуль-жа будзе панаваць гэты зьдзек над нашым народам?

Чэрэскі.

Паседжаньні Праваслаўнай Камісіі Б. Н. К-ту.

Дня 11 і 19 г. м. адбыліся нарады сяброў Праваслаўнай Камісіі пры Бел. Нац. К-тэце, на якіх зроблена некалькі пастановаў у справе царкоўна-беларускай, а так-жа пастаноўлена выступіць з дамаганьнем выясьненьня і справы Чэрэскай.

БЕЛАРУСКАЯ ХРОНІКА.

Арганізацыя белар. тэатру ў Вільні. Беларускі тэатр у Вільні яшчэ ўсё ў стане арганізацыйным; як чуваць, ужо пачынае гатовіцца да публічнага выступленьня. Беларускае грамадзянства гэту пляцоўку хіба-ж падтрымае, бо гэтага вымагае абавязак нацыі.

З выдавецкае нівы. Выйшаў з друку: „Шлях Моладзі“ № 3, 1934 г. за м-ц сакавік, часопісь беларускай моладзі.

„Золак“ № 1 (4), Вільня, сакавік, 1934 г., часопісь беларускіх соц.-рэвалюцыянэраў.

Нешта чуюць нядобрае. „Родны Край“ № 5, орган „białorusinów-polaków“ у зацемцы „Чарговая правакацыя“ (а як-жа!) „udaje oburzonego“, што „Бел. Кр.“ быццам падала вестку, што ў Бел. Філіі Дзярж. Гімн. ім. Славацкага разводзіцца кіраўніком гэтай філіі комунізм. Вось-жа „крыху“ ня так. Мы („Бел. Кр.“ № 11, зацемка ў бел. хроніцы: „Што дзеецца там, дзе вучыцца бел. моладзь“) толькі паўтарылі вестку, якая аб справе комунізму ў філі паявілася ў прэсе (Гл. № 2 „Б. П.“, зацемка: „Новы наступ на бел. гімназію“), далей мы там-жа падалі факт, што 25.II. вучняў бел. філіі вадзілі на польскі рэфэрат, дзе выступаў ведамы на віленскім грунце комуністычны агітатар Капала і ўрэшце мы ў тым-жа № „Б. Кр.“ і ў тэй-жа зацемцы цьвердзілі, што комунізм сярод моладзі гэнай філіі усёждыкі пашыраецца.

І сапраўды, чуткі аб гэтым сумным зьявішчы ўпорыста паўтараюцца сярод віленскага бел. грамадзянства.

Знаючы-ж добра „ідэовае“ аблічча кіраўніка гімназіі і яго галоўнага дарадчыка, а так-жа помнячы, што з бел. моладзяй пад іх „апекай“ некалькі гадоў таму ў Віл. Бел. Гімн. дзеелася, мы пачуваліся да абавязку прасьцерагчы бел. грамадзянства, а прадусім бацькоў, каб на гэту справу зьвярнулі ўвагу, бо ў гэных людзей і немагчымае можа стацца магчымым.

Вось-жа мы, што ад нас залежыла, зрабілі і абавязак свой споўнілі.

А што „białorusinów-polaków“ нашыя рачовыя і слушныя ўвагі „абурылі“, дык гэта толькі пацьвярджае факт, што з „філіяй“ ідаць справа стаіць дрэнна. „Białorusini-polacy“ моцна крычалі „лаві злодзея“, калі разводзіўся ў сваім часе ў Віл. Бел. Гімн. (да якой яны былі больш чым блізка), комунізм, моцна яны тое-ж крычалі, калі гэную-ж гімназію аддавалі палякам. Цяпер, магчыма, прыходзіць час, калі гэным банкротам могуць сказаць: „murzyn swoje zrobił, murzyn może odejść“.

Дык тым больш прасьцерагаем беларускае грамадзянства.

Biełaruskaja mowa ŭ Areščychi. Na nawukowaj zborcy T-wa „Przyjaciół Nauk“ u Wilni 17.III. h. h. magistar St. Stankiewič pračytaŭ referat ab biełaruskaj mowie ŭ E. Areščychi (E. Orzeszkowa).

Referent dakładna zanalizawaŭ biełaruskuju mowu tworaŭ Areščychi, pradstawiŭ, jak u jej adbiwajucca ŭsie haloŭnyja asabliwaści biełaruskaj mowy, i wykazaŭ, što hetaja mowa jość biełaruskaj mowaj tej miajscowaści, dzie Areščycha najbolš prabywała, h. zn. Horadzienščyny.

U dyskusii nad referatam cikawyja ŭwahi dakinuŭ praf. Kaściałkoŭski ab tym, čamu biełaruskaja mowa ŭ Areščychi časta jość mocna spolonizawanaj. Prof. Kaściałkoŭski raskazaŭ, jak z sabranych im biełaruskich pieśniaŭ z Sakolskaha pawietu mahli drukawacca ŭ waršaŭskim časapisie „Wisła“ tolki tyja z ich, jakija byli napaławinu spolščanyja, bo drukawać pabiełarusku (asabliwa łacinkaj) było tady carskim uradam sroha zabaroniena. Mahčyma, — pawodle praf. Kaściałkoŭskaha, — što dziela hetaj samaj pryčyny i Areščycha časta biełaruskija skazy padawała ŭ spolščanaj formie, bab jany mahli prajšci praz cenzuru.

W.

БЕЛАРУСЫ! Падтрымлівайце сваю прэсу! Выпісвайце найстарэйшую беларускую газэту „Беларуская Крыніца“!

Užo sam fakt lišnie wialikaje častaści chwaroby wyhladaje padazronna. I biazumoŭna, pad pajmom rožy iduć roznyja zapaleńni ciahlicaŭ (muskułaŭ), suchažyllaŭ, padskurnaje tkaniny, sustawaŭ i h. d. Susim inšy charaktar, inšaje lačeńnie i mahčymaść azdaraŭleńnia ŭ henych chwarobach, jak u rožy. Wyšej pieraličanyja chwaroby mohuć być roznajakaha pachodžańnia, a roža heta chwaroba susim jasnaja, chwaroba zaraznaja, jakaja wyklikajecca wiadomymi bakteryjami.

Hlańma bližej na henuju, susim užo nie takuju častuju, chwarobu. Wyklikajecca „streptakokami“ rožy (łancužkapadobnyja kłubočki rožawych zapaleńniaŭ, takija bakteryi). Uwachodnymi dźwiarmi dla hetych kłubočkaŭ, značycca miescam, praz jakoje jany najčaściej traplajuć u arhanizm čaławieka, buduć rany, niachaj i nadta niewialičkija ci susim niaprykmietnyja: ekzema, badziulki i h. d. Paśla trascy dawoli wialikaje i harački da 40°, časami wanitaŭ, źjaŭlajecca wostraje zapaleńnie skury. Skura na chworym miescy bryniaje (puchnie), čyrwanieje; nabryniaŭšaje čyrwonaje miesca wostra admiažowana ad zdarowaha cieła — taki amal wostry pierachod, jak z hubaŭ da skury barady. Adnačasna sa skuraju bryniajuć časta i załozy limfatyčnyja. U ciažkoj rožy aprača nabrynieńnia na chworym miescy pajaŭlajucca puzyry z žaŭtawataju žyžkaju (syrawatka z krywi). Puzyry henyja paźniej ciamniejuć i žyžka huścieje i z jaje robicca hnoj (materyja).

Chwaroba trywaje niekalki dzion (4—5). Haračka raptoŭna mienšaje, nabryniaŭšaje miesca asiadaje, puzyry zasychajuć i chwaroba kančajecca tym, što skura na chworym miescy łuščycca. Kali roža była na skury, paroššaj wałasami, — jany wychodziać, chacia chutka adrastajuć.

Najčaściej sustrakajecca roža na twary i pačynajecca ŭznoŭ najčaściej ad nasa. Pryčynaju taho, što kala nosa najachwatniej siadzić henaja chwaroba, błahaja prywyčka kałupać u nasie. Kałupańnie błaha ŭžo kaža ab uzhadawańni čaławieka i zaŭsiody nosie z saboju niebiaśpieku zarazy rožaju. Što nia kožny maje rožu, chto kałupaje ŭ nasie, heta jašče nie pawinna spyniać starejšych, asabliwa baćkoŭ, kab nahladali za dziaćmi i prywučyli zmałku da taho, jak treba ačyščać nos.

Roža nia susim užo takaja niawinnaja chwaroba, jak wyhladała-b z taho, što ab joj tolki što było skazana. Kali jana sa skury pierabiarecca na ślizistuju pawałoku horła, — čaławiek lohka moža zadušycca ad niedachopu pawietra ŭ lohkich. Traplajecca, što roža sa skury pierachodzić na mazhawyja bałony. Tady niebiaśpieka ŭžo nadta wialikaja. Wielmi niamiła, kali pry rožy źjaŭlajecca zapaleńnie siaredniaha wucha (boli wucha, hnoj ciače, čaławiek časowa hłochnie). Ahułam kožny staršy čaławiek ciažka zmahajecca z chwarobaju, dla maładych jana mienš strašnaja.

Roža—chwaroba zaraznaja. Dziela hetaha treba nahladać za čyściniaju kala chworaha i kala siabie, kab samomu nie zachwareć dy inšych nie zarazić. Najlepš chworaha pakłaści ŭ asobnuju susim kamorku, dy kab chadziła kala jaho tolki adna asoba. Adnej asobie lahčej uścierahčysia ad zaražeńnia, čymsia niekalkim.

Leku susim peŭnaha na hetu chwarobu niama. Pry chatnich umowach najlepš šmarawać jodam pajasok zdarowaj skury šyryniaju na 3—4 cm. nawokał chworaha miesca, kab zatrymać pašyreńnie bakteryjaŭ z chworaha miesca, kampresy z aluminijowaha woctu (świncowaja prymočka), bornaha kwasu, wodki (da 30—40 prac). Nadta ważna, kab nie asłabieła serca. Dobra dziela hetaha dać mocnaje harbaty, kawy, adnu — druhuju čarku harełki.

Paśla azdaraŭleńnia paściel, chuścio, wopratku chworaha dobra ačyścić, pa miery mahčymaści zrabić dezynfekcyju.

. tej niaprymuso-

Hoład, tyfus, suchoty i wošy ŭ Nawahradčynie.

Niaraz my pisali ab hoładzie i niedastatkach biełaruskaha sialanstwa nia tolki ŭ Wilenščynie, dzie i aficyjalna ščwierdžany hoład i niedastatki nieabchodnych u žyćci praduktaŭ, ale i ŭ Nawahradčynie i na Palešsi. Nam, małčyma, kiraŭničyja kruhi i nia wieryli: „wiedama, apazycyja, dy jašče i biełaruskaja", dyk woś chaj pasłuchajuć, što pišuć ab hetym „Kurjer Wileńsko-Nowogródzki" i „Kurjer Baranowicki". Hetyja hazeciny wywodziacca z adnaho hniazda z „Kurjeram Wileńskim" i razam wyražajuć u našym Kraju dumku B.B. I woś jany ćwierdziać, što biełaruskaje sialanstwa ŭ Nawahradčynie nia susim ciomnaje i wieryć sučasnaj medycynie, ale nia lečycca, bo abiadniela i nia maje zašto, a filantropaŭ i apostałaŭ medycyny na siale niama. Myla siarod sialanstwa ŭważajecca ciapier roskašaj. Kali tudy zahlanie lekar (kazionny), dyk sialanie hurmam ablahajuć i prosiać lačyć rachityčnych poŭhałodnych ichnych dziaciej. Adna „lekarskaja ekspedycyja" adwiedała 38 wiosak, ahladzieła 4,352 dziaciej školnikaŭ i 855 małych da 3 hadoŭ. Pracantowa stan zdaroŭja dziaciej pradstaŭlajecca hetak: a) dziaciej školnikaŭ — brudnych, nia mytych 25 prac., wašywych 75 prac., b) dzieci da 3 hadoŭ — krywizna 18 prac., bronchity 27 prac., chwaroby skurnyja 9 prac., skrofuličnyja 9 prac. Bolšaść hałodnyja. Šyrycca tyfus. Wielmi časta dzieci iduć u školu z dalokich wiosak naščo, majučy ŭ torbaccy tolki sa dźwie bulbiny. Dakarmliwańnie dziaciej treba ar hanizawać biezadkładna. Hetak hadujecca maładoje pakaleńnie na wačoch świedamych baćkoŭ i razumiejučych žyćcio lepšaje, katoryja i sami nia zdolnyja da fizyčnaj ciažkoj pracy, bo adžyŭlajucca ŭsialakimi astatkami i dziela hetaha pamirajuć z asłableńnia i hoładu.

Hetak padajuć z Baranawič, a z Lidy pišuć, što tam dzieci hramadoj žabrujuć, jakich treba hramadzkim koštam utrymliwać.

Hatujucca wajawać.

Sawiety hatujucca wajawać z Japonijaj paśpiešna. Praz Sibir ciahniki woziać užo wojska na Daloki Uschod i wajennyja pryłady: harmaty, tanki, amunicyju, nawat i charčy. Taksama paśpiešna strojać druhuju čyhunku praz Sibir. Hazety padajuć, što na Dalokim Uschodzie Sawiety majuć užo 600 tankaŭ.

Padajuć wiestki z Siaredniaj Ameryki, što praz Panamski kanał pierajechała z Čili za adzin miesiac 12 karabloŭ napoŭnienych nitratam, patrebnym dla wyrableńnia strełaŭ na wajnu. Najbolš nitratu ŭ Čili kuplaje Japonija i Sawiety, a tak-ža Francyja i Anhlija. Apračа hetaha Japonija ŭžo hod času skupliwaje ŭ Amerycy i Meksycy staruju stal, žaleza, woława, bawoŭnu i ŭsio, što tolki patrebnaje dziela wyrableńnia zbroi i amunicyi.

Heta-ž usio robicca nia dziela zabaŭki, a hatujucca wajawać.

Nowy sajuz troch.

Ciapier nastała moda na sajuzy. Kožnaja dziaržawa starajecca ŭkrapić swajo pałažeńnie i šukaje sabie pryjacielaŭ. Woś niadaŭna, bo ŭ hetym miesiacy, adbylisia narady ŭ Rymie pradstaŭnikoŭ 3 ch dziaržaŭ: Italii, Aŭstryi i Madziaryi. Aficyjalna narady byli ŭ sprawie ekanamična-haspadarčaj. Adnak hetyja hutarki, što zakrapili miž hetymi krainami handlowyja dahawory, narabili niamała ŭ Eŭropie šumu, a heta tamu, što ŭ Eŭropie poŭnaje palityčnaje biazładździe, jakoje pachiramancku ŭtrymliwajecca paktami i sajuzami, u siłu i trywałkaść jakich i sami padpisaŭšyja ich nia susim wierać. Adnak faktam jość, što Mussolini pašyraje swaje ŭpływy nad Dunajem.

Wajennaje pałažeńnie i źmiena ŭradu ŭ Estonii.

U maleńkaj dziaržawie Estonii nadowiačy zawiedziena wajennaje pałažeńnie; estonskija ŭłady wykryli zmowu dziaržaŭnaha pierawarotu i ŭrad paśpiašyŭ sparalizawać hetu dziejnaść Pašla hetaha ŭrad padaŭsia ŭ adstaŭku, a pawadyr sialanskaha sajuzu Ulmanis zarhanizawaŭ nowy ŭrad. Na čale abarony dziaržawy ŭnutry staić hienerał Laidoner. Majuć adbycca ŭ Estonii i wybary nowaha prezydenta, ale ciapier adłožany pakul supakoicca ŭ dziaržawie i skasujecca wajennaje pałažeńnie.

na sioletni Wialikdzień majuć balšawiki ŭsie hurmam zrabić „nastup na nieba."

Achwiary rewalucyjnych zawarušeńniaŭ u Francyi. My padawali ab zabureńniach u Paryžy, jakija paŭstali z pryčyny wialikich ašukanstwaŭ abniatych aferaj Stawiskaha. Wiedajem, što ŭrad pad naporam uzburanaj hramadzkaj apinii padaŭsia ŭ adstaŭku, a parlamant zarhanizawaŭ kamisiju dziela prawiadzieńnia śledztwa ŭ sprawie Stawiskaha i krywawych zabureńniaŭ. Kamisija heta śćwiardžaje, što ŭ časie hetych zabureńniaŭ zabitych 18 asob, ranienych cywilnych 627, palicejskich 969 i žaŭnieraŭ 695.

Biazładździe na Kubie. Užo kala 2 hadoŭ na Kubie adbywajucca roznaha charaktaru zabastoŭki i zabureńni. Ciapier iznoŭ tam pačalisia krywawyja zawarušeńni i ahulnyja zabastoŭki.

Polskim rabotnikam niama pracy ŭ Francyi. U Francyi ciapier jość mnoha polskich emihrantaŭ-rabotnikaŭ. Dasiul jany mieli tam pracu, pieraważna ŭ francuskim promyśle. Ciapier francuski ŭrad wydaŭ zahad pramysłoŭcam u Francyi, kab jany ŭ pieršuju čarhu prymali na rabotu rabotnikaŭ francuskich. Dziela hetaha pačali tam zwalniać ad raboty miž inšymi i emihrantaŭ z Polščy, jakija musiać waročacca damoŭ.

U Hišpanii usio nie spakojna. Wa ŭsiej Hišpanii niadaŭna ŭłady raźwizali arhanizacyju „Narodny Sajuz Pracy," bo tam hurtujucca manarchistyčnyja elementy. Abwieščana tak-ža ahulnaja zabastoŭka, z jakoj urad zmahajecca. Słowam, tam jašče ŭsio niama stałaha supakoju.

Z KRAJU.

Hraf i sielanin. Niadaŭna zakončyŭsia sudowy praces za źniewahu hrafam sielanina; hraf pakarany sudom na 100 zł. kary. Sprawa pradstaŭlajecca hetak. Wakoličnyja sialanie dwara hrafa Jazepa Tyškiewiča źwiarnulisia da apošniaha z prośbaj pamahčy im u hramadzkaj sprawie. Hraf adnaho sielanina tady ni z siaho ni z taho abłajaŭ słowami „swołač, kamunist, balšawik i h. d.". Sielanin padaŭ Tyškiewiča ŭ sud, u wyniku jakoha Tyškiewič pakarany na 100 zł. kary.

Razwodździe. Užo raspranulisia našyja reki i ručajki, skidajučy z siabie ladowaje pakrywała; niekatoryja pačali raźliwacca ŭšyrki i zatapiać nadbiareżnyja łahčyny. Hroznaje heta jawišča, ale nie biezradziejnaje; razwodździe — heta-ž zhon zimy i pačatak wiasny.

Utanuŭ. Kala wioski Kamień, Wialejski pawiet, nadowiačy padčas uzrušańnia lodu na Wialli K. Matwiejeŭ 56 hadoŭ utanuŭ; jechaŭ miž lodu ŭ łodcy i łodka pierawiarnułasia.

Z WILNI.

Zwalnieńnie z wastrohu litoŭcaŭ. Jak piša „Viln. Ryt." (Nr. 23) 15.III. z Łukiskaha wastrohu zwolnieny cełу rad litoŭcaŭ, arыštawanych kolki tydniaŭ tamu, u ich liku i R. Mackiewič, wiedamy litoŭski dziejač, publicyst i piśmieńnik.

Nadbałtyckaja žydoŭskaja kanferencyja. Bywajuć usiudy i ŭsialakija konferencyi. Dyk woś źjechalisia i ŭ Wilniu na konferencyju Žydy sijonisty z Litwy, Łatwii i Estonii. Miž delehatami jość i redaktar kowienskaj hazety „Idiše Stimme" Rubinštejn. Hetych delehataŭ witaŭ u Wilni dr. Wygodzki.

Marš Piłsudski na swaich imianinach u Wilni. U paniadziełak 19 h. m. na wulicach Wilni byŭ światočny wyhlad; byli wywiešany ściahi i adbyłasia wajskowaja defilada. Heta byli imianiny marš. Piłsudskaha, na jakija imianińnik i sam pryjechaŭ z Waršawy.

Roznyja wiestki.

Z UKRAINSKAHA ŽYĆCIA.

Aryšty ŭkraincaŭ u Lwowie. Tamašniaja palicyja dakanała rewizijaŭ u mnohich ukrainskich dziejačoŭ, šukajučy nielehalnaj literatury. Pašla hetych obyskaŭ 10 asob aryštawanych.

Światočny wiečar Tarasa Šewčenki ŭ Wilni. Ukrainski hurtok studentaŭ u Wilni dnia 20 h. m. ładziŭ uračystyja abchodziny 120 hadaŭščyny naradzinaŭ TarasaŠewčenki. Światočny wiečar adbyŭsia ŭ Małoj Hareckoj zali z nastupnaj prahramaj: 1) „Zapowit" T. Šewčenki ŭračysta z poŭnatoj pawahi wykanaŭ pryhožym śpiewam chor pad kiraŭnictwam wiedamaha ŭ Wilni rehienta Matwijca. 2) Bahaty źmiestam ab Šewčenku i jaho tworčaści referat krasamoŭna pračytaŭ Ul. Decyk i 3) pa mastacku byŭ pradstaŭleny sceničny twor Tarasa Šewčenki „Nazar Stodola" (drama ŭ 3-ch aktach z ukrainskimi narodnymi pieśniami i tancami)

Z POLŠČY.

Budžetnaja sesija Sojmu i Senatu. Dekretam Prezydenta Polščy dnia 15 h. m. začyniena.

Pliamisty tyfus. My padawali, što i ŭ Polščy pustošyć ludziej tyfus. Dalej polskija hazety padajuć, što hetaja pošaść pajaŭlajecca i ŭ Haliččynie. Pašyreńnie henaj pošaści wymoŭna świedčyć ab dastatkach nasielnictwa; dzie narod nie haładuje i časta z mylam myjecca, tam tyfusu nia bywaje.

Polšč kuplaje zbožža. Pawodle ŭradawaj statystyki ŭ 1933 h. u Polšč pryweziena z zahranicy 305 tys centnar. pšanicy, žyta 133 tysiačy centn., kukuruzy 40 tysiač centnaraŭ. Apračа hetaha, pryweziena 641 tys. centn. ryžu bliž na 13 milijonaŭ zł. Nia mała prywieziena z zahranicy i syrych skuraŭ, bo 181 tys. centn na 22 z paławinaj milijonaŭ zł. Prywieziena tak-ža i tłuščaŭ 250 tys. centn. na 15 milijonaŭ zł.

Hetych tawaraŭ pierawažna chapaje ŭ Polščy, adnak jany prywoziacca z zahranicy; handal z zahranicaj narmujuć handlowyja dahawory, jakija ŭ sabie časta majuć i charaktar palityčny.

Z ZAHRANICY.

Nowy balšawicki „nastup na nieba." Zahraničnyja hazety padajuć, što sajuz biazbožnikaŭ u SSRR. pastanawiŭ uzmocnić baraćbu z relihijaj. Hetu pastanowu pajaśniajuć tym, što ŭ SSRR. relihijny ruch nia tolki nie asłabieŭ, ale akrep. Narod za swaje hrošy pačaŭ adčyniać, začyniеnyja śpiarša, cerkwy. U źwiazku z hetym

Piśmy z wioski.

I tut biełarusy.

w. Barščewa, Biełastockaha paw Wialikaja naša wioska. Lažyć jana tolki wosiem kilametraŭ ad Biełastoku. Darohi ŭ nas až pałyskujucca. Usiudy šosy. Pa šosach, choć redka, ale nie pierastajuć chadzić čornyja ad pyłu aŭtabusy.

Jak raz siarod našaj wioski staić hmina, a razam u jej i škoła. Budynak stary. Choć pabieleny, ale niaprynadny. Pa kancoch wioski stajać młyn wiatrak i kuźnia. I mielnik naš i kawal haworać z ludźmi tolki pabiełarusku. Mielnik i kawal u nas dobryja ludzi. Tolki ŭ našu hminu i školu z biełaruščynaj nielha pakazacca. Wučycel u škole, a sekretar u hminie ludzi čužyja, bo adniekul zdaloku pryiezienyja.

Sekratar mnoha biady maje z tutejšymi wojtami, časta ich minaje, a wojty našy nijak dapasawacca nia mohuć da wymahańniaŭ sekretara — hetaha dziŭnaha ŭ nas i čužoha čaławieka.

Našy ŭ wioscy pahnalisia za zarabotkami i strojnuju našu wiosku durniami zawalili. Durniaŭ z Charoščy (z špitala) u nas wazami woziać i ad štuki tryccać złotych u miesiac majuć. Za durniami ŭ nas nielha na wulicu wyjšci. Jany, praŭda, z ludźmi nia bjucca, ale prykra nam i našym dzieciam hladzieć na heta.

U biełaruskija hazety wioska Barščewa traplaje peŭna što raz pieršy, ale jana z biełarusami była ŭžo znajoma daŭna.

Kališci my čytali „Biełaruskuju Krynicu", ale ciapier da nas jana nie dachodzie. U biełaruskaści nam krepka pamoh ksiondz Rešeč. Jon kališci kazaŭ nam: „Swaja kašula — bliżej cieła" — „Swaja matka—najradniejšaja." A słowa ksiandza Rešecia „Baćkaŭščyna" my i ciapier paŭtarajem. My ksiandzu Rešeciu mocna wierym i jaho tut dobra sabie choć nia bočym, ale šanujem. Hetak mocna pašanuli jon nas na biełaruskaja nohi! Jahonyja słoŭcy i siahońnia nas ažyŭlajuć. Pašla nawuki ksiandza Rešecia, skolki razoŭ my nia wyjdzim na našu strojnuju šosu, dyk zaŭsiody nam doŭha hladzieć choćcyca na Biełastok, a za im na šyrokuju Biełaruś. U druhi-ž bok na Waršawu my redka pahladajem.

U našaj wioscy jašče jość i dom ludowy, ale jon pusty i wiečna zamkniony. Zbudawała jaho „Koło Młodzieży Wiejskiej." Koła hena ciapier u nas rassypałasia. U Barščewie jość sa try damy murawanyja i try damy strojna. Buduć sa try damy čystych prawasłaŭnych. I znajducca na ŭsiej wioscy sa try haspadary, što dzieciam swaim pabiełarusku hawaryć zabaraniajuć. Praŭda, što z hetych apošnich mudrahelcaŭ ludzi našy śmijajucca. U škole wučyciel našych dziaciej łomie, a jany ŭžo ništo sabie papolsku nałažylisia, ale i pabiełarusku dzieci našy čytajuć, byccam repu hryzuć. Nia było-b usio ab Barščewie, kab paminuć našu S.M.P.

Usie što da adnej dziaŭčaty u Barščewie papisalisia u S.M.P. Ale zatoje chłopcy našy, dyk małajcy! U S.M.P. nie pašoŭ ani adzin. U ludowy dom dziaŭčat našych nia prymajuć, bo nie jany heny dom budawali. Światlica dziaŭčat u asobnym miejscy bliżej da kawalichi patronki.

Na adno našaj dziawockaj maładziežy nia šeńcie. Jany ščaśnia nia majuć na zamužža. Kali nastrojacca jany, zadziraić swaju hełoŭku, dy jažyčok swoj puščać papolsku, dyk našy chłapcom tady anijak da hetych dziaŭčat prystupicca! Užo i starejšyja ŭ wioscy šepčuć, što dziaŭčaty našy zamuž nia wychodziać, bo im peŭna SMP. psujeć zamužža.

U Barščewie ŭsie žywuć zhodna. Adzin druhomu nichto ŭ darohu nia ŭchodzie.

Barščeŭski.

Грамадзяне! Закладайце Гурткі Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры!

redakta JanPoźniak Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 3. Wydawiec: A. Šutowič.